*“Не пытай аб тым, што твой Край можа для цябе зрабіць, а спытай сябе аб тым, што ты можаш зрабіць для свайго Краю.”*
**John F. Kennedy**

# навіны MASTY.BY

*ЯНЫ хочуць - МЫ можам!!! МФ*

**№ 3 травень 2004 г.**

*Маладзёвы бюлетэнь Мастоўшчыны*

# “Лімоны” зьявіліся і ў Мастох




***10 красавіка*** адбылася сустрэча прадстаўнікоў маладзёвых арганізацыяў Мастоўшчыны з прадстаўнікамі руху “Лімон”. На сустрэчы лідэры моладзі абмеркавалі шэраг актуальных для моладзі праблемаў Мастоў, а таксама шукалі шляхі вырашэньня гэтых праблемаў.

Найбольш злабадзёнымі сярод іх выявіліся вялікі ўзровень беспрацоўя сярод моладзі, масавы выезд моладзі з Мастоў, беспэрспэктыўнасьць. Таксама моладзь занепакоена адсутнасьцю дзяжурнай аптэкі, рок-клюба й розна-плянавых масавых забаўляльных мерапрыемстваў, фэстываляў



*с. 2*

## АБВЕСТКА

Запрашаем мастоўскую моладзь да супрацы ў нашым маладзёвым бюлетэні. Асноўнае патрабаваньне да аўтараў - любоў да нашай Бацькаўшчыны. Далучайся! Цікавыя падарожжы, шчырая кампанія аднадумцаў, працу й адпачынак мы гарантуем! Аўтары лепшых артыкулаў будуць узнагароджаны каштоўнымі прызамі.

***Кантактны тэл. 80296801072 (Алесь), e-mail: paniamonnie@tut.by***

# Музычны кактэйль у Горадні

У Каледжы Мастацтваў імя Цёткі ў чацьвер 22 красавіка адбыўся канцэрт. Аматары року, джазу і блюзу атрымалі магчымасьць папесьціць свае вушы незвычайным кактэйлем рознастайных музычных накірункаў. Канцэрт пачаўся а сёмай гадзіне ўвечары і скончыўся а дзявятай. Студэнты 3 - 4 курсаў паказвалі, чаму іх навучылі за гэтыя гады настаўнікі, некаторыя зь якіх , дарэчы, тасама выступілі разам з сваімі навучэнцамі. Акрмя таго ў канцэрце прынялі ўдзел гурт ”Death Bringer” і госьць з Ліды, гітарыст Юрый Іваноў.

# Травеньскі Сойм - хто пераможа?

18 красавіка на штаб-кватэры маладзёвага руху “Малады Фронт” у Менску адбылася апошняя Цэнтральная Рада МФ 4-га склікаsucceeded, на якой прысутнічаў 21 чалавек.

На ёй былі вырашаны арганізацыйныя пытаньні па правядзеньню 5 Сойму маладзёвага руху “Малады Фронт”.

Згодна рашэньню Цэнтральнай Рады правядзеньне Сойму было перанесена з 30 на 23 траўня 2004 году ў сувязі з правядзеньнем 30 траўня цэнтралізаванага тэсту па беларускай мове, у якім прымае

*с. 2*

# Lingua Latina- унівэрсальны сродак ад дрэнных адзнак

***Хочаш, каб настаўнікі не чапляліся да цябе кожны ўрок? Хочаш паказаць, who is who ў тваёй школе, каледжы, унівэрсытэце? Хочаш даказаць, што ты ня нейкі там калгасны лох, шпанюк гарадзкіх падвалаў, а сапраўдны пацан?***

***с. 3***

# Дык, хто ж такі Браніслаў Тарашкевіч?

***“На пачатку стагодзьдзя Тарашкевічаў правапіс быў адзіны і натуральны. Тарашкевіцай напісаная ўся клясычная беларуская літаратура - зь мяккімі знакамі пісалі Купала й Колас, Багдановіч і Гарэцкі, Жылуновіч і Чарвякоў.”(радыё “Свабода”)***

Невядомае заўсёды палохае людзей. Яны ўсялякім чынам стараюцца адпіхнуць тое, што ім не зразумела. Так, у нашым мястэчку ёсьць людзі, каторыя, магчыма, па няведаньню ставяцца досыць агрэсыўна да беларускай мовы ў яе клясычным варыянце, які зафіксавала граматыка, што ўклаў Браніслаў Тарашкевіч, слынны дзяяч Беларусі, акадэмік АН Беларусі.

*с. 4*

# “Лімоны” зьявіліся і ў Мастох

**На старонках моладзевага бюлетэню *MASTY.BY* могуць друкавацца прыхільнікі розных палітычных, грамадзкіх, культурных, рэлігійных поглядаў. Рэдакцыя не заўсёды падзяляе іх меркаваньні!**

для моладзі, перашкодамі, што чыняцца моладзевым ініцыятывам асобнымі прадстаўнікамі мясцовых уладаў. Лідэры моладзі хацелі б таксама, каб у Мастох была дыскатэка належнага ўзроўню, дзе можна было б набыць штосьці папіць. Дагэтуль у горадзе на дыскатэках забаронена адчыняць бары, што прыроўнівае нашыя дыскатэкі да вясковых клюбаў.

На сустрэчы лідэры маладзёвых арганізацыяў выказалі занепакоеннасьць катастрафічным падзеньнем рэйтынгу Аляксандра Рыгоравіча, якое падцьвердзіла грамадзкае галасаваньне “Супраць 3-га тэрміну”, што было праведзена несумленнымі апазыцыянэрамі з Гомлі 7 лістапада 2003 году на афіцыйна дазволеным Гомельскім гарвыканкамам пікеце. З ***2172*** чалавек ***супраць*** выказалася ***89,6%***, і гэта ва Ўсходняй Беларусі, апірышчы нашага Прэзыдэнта, а што ж будзе ў Заходняй Беларусі, на Гарадзеншчыне, ў Мастох, дзе традыцыйна рэйтынг кіраўніка нашай дзяржавы ніжэйшы. Таму ўдзельнікі сустрэчы вырашылі ўсялякім чынам дапамагаць і падтрымліваць А.Г. як маральна, так і фізычна. А што рабіць, калі нават бліжэйшыя паплечнікі БРСМаўцы, сотнямі пераходзяць у апазыцыю (як тое робяць несумленныя маладзёны з Баранавічаў), а Захад, Амэрыка ды Крэмль пасьпелі пасварыцца з нашым Прэзыдэнтам, ды усялякім чынам яго дыскрэдытуюць, вядуць інфармацыйную вайну. Дзякуй богу, яшчэ Афрыка нас падтрымлівае. Тут нашае хваленае беларускае выслоўе “мая хата з краю, нічога ня знаю” павінна быць жорстка адкінута кожным сапраўдным патрыётам.

***З. К.***

# Травеньскі Сойм-хто пераможа?

*працяг. Пачатак на с. 1.*

удзел вялікая колькасьць маладафронтаўцаў. На Сойме адбудуцца выбары новага кіраўніцтва МФ на бліжэйшыя 2 гады. На час вёрсткі газэты вядома 2 кандыдаты на пасаду кіраўніка МФ- 22 -гадовы Зьміцер Дашкевіч, старшыня Менскай гарадзкой Рады МФ, і Сяржук Бахун, кіраўнік Берасьцейскай абласной арганізацыі МФ. У Цэнтральнай Радзе прынялі ўдзел 2-е прадстаўнікоў Мастоўшчыны, якія разам з маладафронтаўцамі Менску, Гарадзеншчыны, Меншчыны, Гомельшчыны выказалі Зьмітру Дашкевічу падтрымку й упэўненасьць у тым, што на травеньскім Сойме адбудзецца зьмена пакаленьняў і ён будзе абраны старшынём маладзёвага руху “Малады Фронт”.



*У якасьці падарунка ўсім удзельнікам Сойму заплянаваны канцэрт найбольш папулярнага й любімага як сярод маладафронтаўцаў, так і ўсёй астатняй моладзі Беларусі гурта NRM.*

***падрыхтаваў ZK***

**Патэлефануй 16 траўня з 11 па 12 гадзіну на нумар**

***8 0296 945204***

**і скажы пасьлядоўнасьць выхаду альбомаў NRM. 5 чалавек, хто першымі й правільна назаве пасьлядоўнасьць выхаду альбомаў NRM, атрымаюць прызы: касэты з альбомамі NRM і іншых беларускіх гуртоў.**

**Удзельнічай і перамагай!**

# Lingua Latina - унівэрсальны сродак ад дрэнных адзнак

**(N.B. Аўтары здымаюць зь сябе ўсялякую адказнасьць за дзеянні асобаў, якія прачытаюць гэты артыкул)**



*Некалькі словаў і ўсе проста будуць у* ***knock-downe*** *ад тваёй адукаванасьці. Настаўнікі як зачараваныя пачнуць выстаўляць табе выдатныя адзнакі, дзяўчаты будуць увіхацца каля цябе ў чаканьні, што ты зьвернеш на іх увагу й нешта зноў адлепіш на незразумелай, але чароўнай мове.*

У гэтай рубрыцы мы будзем падаваць вядомыя лацінскія выразы, якія сталі крылатымі. Можаш выкарыстаць іх дзе заўгодна. Гэта падкрэсьліць тваю адукаванасьць, а таксама ты зможаш арыгінальным чынам выйсці са складанага становішча на ўроку, асабліва, калі настаўнік палівае цябе брудам і называе невукам.

Напрыклад, уяві сытуацыю. Ты прыходзіш непадрыхтаваным на занятак па матэматыцы. Гучыць званок і ўрок пачынаецца. Безумоўна, настаўніца не забылася на тое, што трэба праверыць хатняе заданьне й позіркам ката, які проста атрымлівае асалоду ад назіраньня мукаў сваёй ахвяры, глядзіць у клясны журнал і шукае, хто ж сёньня будзе спяваць лебядзіную песьню ля дошкі. Табе здаецца, што гэтае імгненьне цягнецца ўжо палову ўрока, хаця насамрэч ня больш за хвіліну. Усе замерлі й схавалі свае твары ў кнігі. Але як заўсёды, не шанцуе толькі табе і настаўніца вызывае да дошкі чамусьці менавіта цябе. Ты выходзіш, мармычаш, што ня змог падрыхтавацца, што дапамагаў цэлы вечар тушыць пажар суседу, альбо ездзіў да бабулі капаць бульбу (у сакавіку), ці ўвесь час дапамагаў навакольным бубулькам у пераносцы вады, альбо мусіў удзельнічаць па асабістай просьбе самага дырэктара ў архіважкіх спаборніцтвах па штурханьні мяча ў вароты супернікаў і г.д. Але ўсе твае перакананьні ніяк ня ўздейнічаюць на каменнае сэрца настаўніцы і яна ўжо амаль што выводзіць у журнале нездавальняюча, як ты прамаўляеш (прамовіць трэба як мага сур'ёзна, можна нават з жалезнымі ноткамі ў голасе):

***Cuiusvis hominis est errare; nullius, nisi insipientis in errore perseverare -*** *Кожнаму чалавеку ўласьціва памыляцца, але толькі неразважліваму чалавеку ўласьціва упірацца*

Супраць Цыцэрона не папрэш. *Таму сам разумееш, што настаўніца будзе проста шакавана табою й тваёй адукаванасьцю, а тут ты можаш папрасіць усё што заўгодна. Галоўнае - зрабіць гэта хутка, каб яна не аправілася ад шоку.Іначай ...*

Гісторыя

# КРОНІКА

## МАСТОЎШЧЫНЫ

***1486 г. -*** Першае ўпамінаньне пра Масты, як мястэчка Гарадзенскага староства Вялікага Княства Літоўскага.

***1551 г. -*** Мастоўшчына ў складзе Рэчы Паспалітай двух народаў.

***16 стагодзьдзе*** - Упамінаньне ў пісьмовых крыніцах населенных пунктаў Рагозніца, Парфёнавічы, Струбніца, Боркі, Курылавічы, Шчара, Букшты (Букштава), Струга, Дубна, Луна, Глядавічы, Чарлёна, Мікелевічы і інш.

***Сярэдзіна 16 стагодзьдзя - 1557г.-*** Аграрныя пераўтварэньні пад назваю "Валочная памера", увядзеньне "уставы на валокі".

***1589 г. -*** Пераўтварэньне Гарадзенскага староства ў Гарадзенскую экномію (каралеўскую), у складзе якой быў Мастоўскі двор з цэнтрам у мястэчку Масты.

***1601,1633, 1653 г.г. -*** Граматамі каралей Рэчы Паспалітай двух народаў жыхары Мастоў атрымалі некаторыя прывілеі згодна Магдэбу***р***скаму праву.

***З 1633 г.*** - У Мастох праводзіліся штотыднёвыя кірмашы і ярмаркі 2 разы ў год.

***1700-1721 г.г.*** - Паўночная вайна, дзеяньні якой праходзілі й на Мастоўшчыне.

***1740 г. -*** Пабудаваны драўляны касцёл Святой Троіцы ў в. Струбніца.

***1794 г.*** Паўстаньне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касьцюшкі, падзеі якога адбываліся і на Мастоўшчыне.

***З 1795 г.*** Пасьля 3 га падзелу Рэчы Паспалітай Мастоўшчына была далучана да Расейскай імпэрыі. Адносілася да Слонімаскага уезду спачатку Віленскай, затым Гарадзенскай губэрній. Былі створнаы Мастоўшская, Дубненская, Пескаўская, Курылавіцкая воласьці.

***падрыхтавала пані Ляля***

КОНКУРС

Газэта **MASTY.BY** абвяшчае конкурс на лепшы артыкул па тэме "Маё мястэчка", што будзе надрукавана ў нашай газэце і прысьвечана Мастам і ўсяму таму, што тычыцца Мастоў. ***Умовы:***

*-Тэкст павінен быць ня больш за 200 і ня менш за 150 словаў.*

**-Артыкул павінен адпавядаць тэме й быць у беларускай мове (правапіс ня мае значэньня: наркамаўка альбо тарашкевіца).**

*-Ліст з артыкулам павінен быць адпраўлены альбо перададзены не пазьней за 10 ліпеня 2004 года.*

**-Удзельнічаюць юнакі й дзяўчаты 12 - 31 гадоў.**

*-Адзін чалавек можа дасылаць неабмежаваную колькасьць артыкулаў.*

**<u>Пераможчаў чакаюць прызы:</u>** ***кніга "Памяць. Мастоўскі раён", кружэлкі , а таксама касэты беларускіх гуртоў.***

***Спрабуй, пішы, перамагай!***

***Вашыя лісты дасылайце на адрэсу:----***

***Алесь, вул. Чкалава 9, 231600 Масты, Гарадзенская вобл.,***

***Альбо тэлефануй на нумар 8 0296 945204 (Зьміцер)***

***Чакаем вашых лістоў.***

**Адшукай у бюлетэні памылку, патэлефануй на нумар 8 0297 7615 50 і паведамі аб ёй. Калі ты патэлефануеш першым, то за кожную знойдзеную памылку атрымаеш касэту з запісам беларускіх выканаўцаў**

# Дык, хто ж такі Браніслаў Тарашкевіч?

***“Ён не любіў засмучацца, залішне бедаваць, -* згадвала Марыя Восіпаўна. - *Падбадзёрваў сваіх блізкіх. Пры гэтым любіў зьвярнуцца ў лісьце да сваіх вяршыкам. Выкарыстоўваў, як кажуць, матывы беларускага фальклёру. Пісаў, што прывык да гараваньня.”***

Шмат хто кажа, дык навошта вяртаць старое? Усе развіваецца, зьмяняецца. Так, сапраўды, усё зьмяняецца і развіваецца, але не гвалтоўна, як тое было зь беларускай мовай, таму менавіта зараз адбываецца натуральнае вяртаньне да сапраўднай мілагучнай беларускай мовы, а не трасяначнай “наркамаўкі”, якая шмат каму гучыць “па-калхознаму”. Пачалося ўсё ў 1933 годзе, калі стала набіраць абароты сталінская машына сьмерці і Савет Народных Камісараў БССР увёў дэкрэтам новы правапіс (сёньняшні афіцыйны, т. зв. “наркамаўка”). На момант увядзеньня усім звыклым нэўтральным быў правапіс Тарашкевіча, які дапрацавалі іншыя моваведы - Лёсік, Станкевіч, Некрашэвіч, Байкоў. На ягоным фоне новы правапіс успрымаўся як моцна палітычна афарбаваны. Гэты правапіс ператварыў беларускую мову ў нейкі беларуска-расейскі гібрыд. За палову стагодзьдзя


Браніслаў Тарашкевіч

ўжываньня гэты гібрыд стаўся звыклым для большасьці насельніцтва, што ў немалой ступені спрычынілася да заняпаду беларускай мовы наагул.

## ПАДПІСКА

Калі Вы жадаеце стала атрымліваць наш бюлетэнь, тэлефануйце на нумар **80296801072 (Алесь)** і замаўляйце. Ад Вас падрабуецца толькі адрэса, куды дасылаць бюлетэнь.

## БІЯГРАФІЯ

Тарашкевіч Браніслаў нарадзіўся 20 студзеня 1892 г. у засьценку Мацюлішкі (цяпер Віленскі раён, Летува) у сялянскай сям'і. У 1916 г. скончыў гісторыка-філялягічны факультэт Петраградзкага ўнівэрсытэта й быў пакінуты пры катэдры расейскай мовы і літаратуры. Працаваў і як прыват-дацэнт грэцкай і лацінскай моў. У 1917 г. быў адным з лідэраў Беларускай сацыялістычнай грамады. У 1918 г. загадваў культурна-асветным аддзелам Белнацкама, яго Петраградскага аддзяленьня. У 1919 г. - выкладчык беларускай і грэцкай моў у Менскім педагагічным інстытуце. У 1920 г. - загадчык беларускага сэктара дэпартамэнта асьветы Сярэдняй Літвы. З 1921 г. - дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. У 1922 г. быў абраны паслом (дэпутатам) у польскі сойм, належаў да левага крыла Беларускага пасольскага клюба, якое цесна зблізілася з камуністычнымі сіламі. Заснавальнік і старшыня Беларускай сялянска-рабочай грамады (1925-1927). Удзельнічаў у III канфэрэнцыі КПЗБ як сябра камуністычнай партыі (1925). У студзені 1927 г. быў арыштаваны польскімі ўладамі, а ў траўні 1928 г. засуджаны на 12 год зьняволеньня. У 1930 г. выпушчаны з астрога. У лютым 1931 г. арыштаваны, у лістападзе 1932 г. засуджаны на 8 год катаржнай турмы. Зь верасня 1933 г. у выніку абмену паліт-зьняволенымі жыў у СССР. Працаваў загадчыкам аддзела Польшчы й Прыбалтыкі ў Міжнародным аграрным інстытуце (Масква). 6 траўня 1937 г. арыштаваны. Расстраляны 29 лістапада 1938 г. Пастанова НКУС ад 5 студзеня 1938 г. адменена Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР ад 26.01.1957 г.

*У беларускім друку выступаў з 1914 г. Выдаў у Вільні «Беларускую граматыку для школ» (1918, вытрымала 6 выданьняў). Пераклаў на беларускую мову «Іліяду» Гамера (урывак змешчаны ў часопісе «Полымя рэвалюцыі», 1935), «Пана Тадэвуша» А.Міцкевіча (1981; Ольштын, 1984). Апублікаваў брашуры «Заходняя Беларусь - плацдарм імперыялістычнай інтэрвенцыі (1931), «Как живут крестьяне за границей» (Масква - Ленінград, 1935), «Дифференциация крестьянства в Польше во время кризиса» (у зборніку «Польская деревня во время кризиса», Масква, 1935).*

***Падрыхтаваў Зьміцер***

Мова выданьня беларуская, рэдакцыйны правапіс клясычны (паводле граматыкі Браніслава Тарашкевіча), матэрыялы таксама могуць друкавацца з выкарыстаньнем іншых граматык беларускай мовы, па жаданьню аўтараў, але пры строгай рэглямэнтацыі рэдакцыйнай калегіі.

Усе матэрыялы праходзяць жорсткую рэдакцыйную цэнзуру на адпаведнасьць ідэалягічнай сістэме беларускай дзяржавы. Аўтары матэрыялаў ня могуць ня несьці адказнасьць за свае матэрыялы.

Кантакт:
e-mail:paniamonnie@tut.by

*Надрукавана ў друкарні “Відродженне“, вул. Лесі Ўкраінкі 22, Львоў, Украіна*
*Замова № 1918*

**Рэдактар:**
**Зьміцер Кухлей**

**Наклад:**
***299 ас.***